**В. Г. Мазец,**

*кандыдат гістарычных навук, вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі (Мінск, Беларусь)*

# МЕМАРЫЯЛІЗАЦЫЯ ПОДЗВІГУ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА – СПРАВА ДЗЯРЖАЎНАГА КЛОПАТУ П. М. МАШЭРАВА

На працягу стагоддзяў Беларусь з'яўлялася месцам жорсткага ваеннага супрацьстаяння. Але самай маштабнай па колькасці чалавечых ахвяр і праяўленага гераізму была, безумоўна, Вялікая Айчынная вайна. Таму невыпадкова, што ўшанаванне памяці ахвяр і герояў той вайны ў БССР набыло характар дзяржаўнай палітыкі.

30 снежня 1965 г. міністр культуры БССР М. А. Мінковіч накіраваў сакратару ЦК КПБ П. М. Машэраву пісьмо, у якім выклаў разгорнутую праграму дзеянняў па ўвекавечанні памяці загінуўшых воінаў і партызанаў, а таксама ахвяр фашызму і мемарыялізацыі памятных месцаў. У ліку прапаноў М. А. Мінковіча адзначым тыя, якія потым рэалізоўваліся на практыцы:

«– ва ўсіх гарадах рэспублікі ўстанавіць абеліскі з пералікам на іх вайсковых частак і партызанскіх брыгад, што прымалі ўдзел у вызваленні гэтых гарадоў;

– устанавіць скульптуры на месцах, дзе загінулі Героі Савецкага Саюза;

– выявіць усе населеныя пункты, цалкам спаленыя фашыстамі, і ўстанавіць абеліскі з указаннем колькасці знішчаных у іх мясцовых грамадзян, а таксама ўстанавіць імёны ахвяр фашызму;

– на месцы былой вёскі Хатынь Лагойскага раёна, цалкам спаленай фашыстамі разам з усім насельніцтвам і не адроджанай, стварыць музей-запаведнік з комплексам адпаведных пабудоў;

– на месцах канцлагераў і месцах масавага знішчэння і пахавання ахвяр фашызму ўстанавіць помнікі, абеліскі або мемарыяльныя дошкі з указаннем колькасці ахвяр;

– на вуліцах, якія носяць імёны герояў, устанавіць мемарыяльныя дошкі са звесткамі пра герояў і кароткім апісаннем іх подзвігаў» [3, с. 148–149].

ПРЕЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

17 студзеня 1966 г. была прынята пастанова ЦК КПБ «Аб далейшай рабоце па ўвекавечанні геранчных подзвігаў савецкіх людзей у перыяд Вялікай Айчыннай вайны» за подпісам сакратара ЦК КПБ Пятра Міронавіча Машэрава. Гэта пастанова не толькі паклала пачатак «новага этапу ў гэтай рабоце, калі асноўная ўвага надавалася мемарыялізацыі памятных месцаў» [3, с. 13], але і з'явілася сведчаннем таго, што справа мемарыялізацыі подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны з'яўляецца ў БССР адным з важнейшых накірункаў дзяржаўнай палітыкі.

У пастанове падкрэслівалася, што за пасляваенны перыяд у рэспубліцы была зроблена вялікая работа па ўвекавечанні геранчных подзвігаў савецкіх людзей у гады барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, але пры гэтым у гісторыі геранчнай барацьбы «маецца нямала выдатных подзвігаў савецкіх людзей, прыкладаў мужнасці і самаахвярнасці ў імя перамогі», якія яшчэ не атрымалі належнай навуковай распрацоўкі, шырокай галоснасці і ўсенароднай павагі, а таксама не адзначаныя ніякімі мемарыяльнымі і іншымі знакамі [3, с. 150]. У сувязі з гэтым перад супрацоўнікамі Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ, Інстытута гісторыі АН БССР, Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і іншых навукова-даследчых і навучальных устаноў ставілася задача актывізаваць сваю дзейнасць па распрацоўцы гісторыі барацьбы савецкіх людзей супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, выяўленні новых матэрыялаў, якія характарызавалі масавы подзвіг нашага народа. Дзеля вырашэння гэтай задачы прадугледжвалася шырока выкарыстоўваць не толькі архіўныя матэрыялы, але і прымяняць увесь арсенал «вуснай» гісторыі: арганізоўваць экспедыцыі на месцы былых баёў і дзейнасці воінаў Савецкай арміі, партызан і падпольшчыкаў, сустрэчы і гутаркі з ветэранамі вайны і відавочцамі найбольш значных падзей Вялікай Айчыннай вайны.

Абкамы і райкамы КПБ, выканкамы абласных і раённых Саветаў дэпутатаў працоўных былі абавязаныя да 30 красавіка 1966 г. сабраць поўныя звесткі пра населеныя пункты, жыхары якіх амаль поўнасцю цалкам былі знішчаныя нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Аддзелам культуры, навукі і навучальных устаноў,

ГРОДЗЕНСКАЯ ВОБЛАСНАЯ НАВУКОВАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

прапаганды і агітацыі ЦК КПБ даручалася накіраваць у вобласці групы навуковых супрацоўнікаў дзеля аказання дапамогі ў гэтай справе абкамам і райкамам.

Для каардынацыі работы па даследаванні і ўвекавечанні найбольш значных фактаў гераізму савецкіх людзей у гады барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ствралася рэспубліканская камісія на чале з С. А. Пілатовічам, у склад якой былі ўключаны члены ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР, архітэктары, гісторыкі і пісьменнікі: І. Ф. Клімаў, І. Я. Палякоў, А. Т. Кузьмін, С. В. Марцалеў, Л. Г. Кляцкоў, М. А. Мінковіч, У. А. Кароль, Л. П. Мятліцкі, В. І. Шарапаў, П. У. Броўка, Г. М. Жабіцкі, С. З. Пачанін, У. І. Стэльмашонак і Э. М. Дзямідаў [3, с. 152].

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы